# Прэзентацыя па беларускай мове па тэме

# «Дзеяслоў»

для слухачоў падрыхтоўчага  аддзялення, падрыхтоўчых курсаў, абітурыентаў

Складальнік –   дацэнт  Чайкова С.В.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Дзеяслоў

1) вызначэнне спражэння дзеясловаў
2) правапіс асабовых канчаткаў дзеясловаў у цяперашнім і будучым простым часе;
3) правапіс канчаткаў рознаспрагальных дзеясловаў;
4) правапіс некаторых асабовых канчаткаў дзеясловаў;
5) правапіс асабовых канчаткаў дзеясловаў I спражэння ў 2-ой асобе множнага ліку;
6) канчаткі дзеясловаў II спражэння;
7) правапіс некаторых суфіксаў дзеясловаў;
8) правапіс *не* (*ня*), *ні* з дзеясловамі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Вызначэнне тыпу спражэння

| *Вызначэнне тыпу спражэння* | *I спражэнне* | *II спражэнне* |
|---|---|---|
| **па канчатках 3-ай асобы множнага ліку** | **-уць/ -юць** | **-аць/-яць** |
| **па канчатках 2-й асобы адзіночнага ліку** | **-еш/-эш /-аш/** | **-іш/-ыш** |
| **па заканчэнні дзеясловаў у неазначальнай форме (інфінітыве)** | ***усе астатнія дзеясловы:***<br>• аднаскладовыя: *ліць, віць, ліць, жыць, шыць, выць* і вытворныя ад іх (*пашыць, пражыць, завыць*);<br>• на *–аць/–яць* (акрамя некалькіх): *купаць, маляваць*;<br>• на *–ець/–эць* (акрамя некалькіх): *старэць, хварэць*;<br>• на *–óць*: *палоць, малоць, калоць*;<br>• на *–уць*: *сохнуць, мокнуць;*<br>• з суфіксам *–ці*: *несці, везці* (акрамя *есці*);<br>• з суфіксам *–чы: стрыгчы* (акрамя *бегчы*) | • дзеясловы на *–іць/–ыць* (акрамя аднаскладовых): *насіць, тужыць*;<br>• наступныя дзеясловы на ***-аць***: *баяцца, гнаць, дрыжаць, залежаць, крычаць, ляжаць, маўчаць, слаць, спаць, стаяць, абветраць*<br>• наступныя дзеясловы на ***–ець***: *вярцець, вісець, глядзець, ляцець, ненавідзець, цярпець* |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# ПРАВАПІС АСАБОВЫХ КАНЧАТКАЎ ДЗЕЯСЛОВАЎ

*у цяперашнім і будучым простым часе*

| *Асоба* | *Асабовыя канчаткі дзеясловаў I спражэння* | *Асабовыя канчаткі дзеясловаў II спражэння* |
|---|---|---|
| **Адзіночны лік** | | |
| 1-я (*я*) | *-у/ -ю* | *-у/ -ю* |
| 2-я (*ты*) | *-éш / -эш/-аш* (пасля зацвярдзелых) | *-іш/ -ыш* |
| 3-я (*ён, яна, яно*) | *-е/ -э/ -а* | *-іць/ -ыць* |
| **Множны лік** | | |
| 1-я (*мы*) | *-ем/-эм/ -ём/ -óм /-ам* | *-ім/ -ым* |
| 2-я (*вы*) | *еце / -эце/ -аце –яце* (*-яцё*) | *-іце/ -ыце* |
| 3-я (*яны*) | *-уць/ -юць* | *-аць/ -яць* |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# ПРАВАПІС КАНЧАТКАЎ РОЗНАСПРАГАЛЬНЫХ ДЗЕЯСЛОВАЎ *БЕГЧЫ, ЕСЦІ, ДАЦЬ*

| *Асоба* | *адзіночны лік* | *множны лік* | *адзіночны лік* | *множны лік* | *адзіночны лік* | *множны лік* |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1-ая | бягу | бяжым | ем | ядзім | дам | дадзім |
| | | | | | | |
| 2-ая | бяжыш | бежыце (бежыцё) | ясі | ясце (ясцё) | дасі | дасце (дасцё) |
| | | | | | | |
| 3-ая | бяжыць | бягуць | есць | ядуць | дасць | дадуць |

# ПРАВАПІС НЕКАТОРЫХ АСАБОВЫХ КАНЧАТКАЎ ДЗЕЯСЛОВАЎ

| Канчаткі дзеясловаў **I** спражэння залежаць ад характару асновы і месца націску і маюць канчаткі: | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **пасля зацвярдзелых** | | **пасля галосных і мяккіх зычных** | | |
| *пад націскам* | *не пад націскам* | *пад націскам* | *у 1-м складзе перад націскам* | *не пад націскам* |
| **о, э** | **а** | **ё** | **я** | **е** |
| мы *сцеражóм*<br>ты *сцеражэш*<br>мы *бярóм*<br>ты *бэрэш*<br>мы *сячóм*<br>ты сячэш | вы *сцеражацё*<br>мы *пішам*<br>вы *пішацé* | мы *жывём*<br>мы *пяём* | вы *жывяцé*<br>вы *пеяцé* | мы *чытáем*<br>ты *чытáеш*<br>мы *мыем*<br>ты *мыеш* |



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

## У 2-ой асобе множнага ліку дзеясловы I спражэння маюць канчаткі:

| -яцé (-яцё) / пасля зацвярдзелых - ацé | | -еце |
|---|---|---|
| вы *жывяцé* (*жывяцё*)<br>вы *завезяцé* (*завезяцё*)<br>вы *смеяцéся* (*смеяцёся*) | вы *сцеражацé* (*сцеражацё*)<br>вы *берацé*<br>вы *пішацé* | вы *збіраецеся*<br>вы *мыецеся*<br>вы *купаецеся* |

| калі ў 1-ай асобе множнага ліку (**мы**) націск падае | | | |
|---|---|---|---|
| **на канчатак** | | **на аснову** | |
| ***-ём/-óм*** | | ***-ем/-ам*** | |
| мы *жывём*<br>мы *пяём* | мы *смяёмся*<br>мы *сцеражóм* | мы *чытáем*<br>мы *збірáемся* | мы *пішам*<br>мы *плачам* |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ
ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Дзеясловы II спражэння ўжываюцца з канчаткамі:

| | | | |
|---|---|---|---|
| *у 2-ой асобе адзіночнага ліку* **(ТЫ)** | | | |
| ***-іш*** **(пасля мяккіх зычных)** | | ***-ыш*** **(пасля зацвярдзелых зычных)** | |
| **ты** ***стаіш*** | **ты** *глядз**іш*** | **ты** *гавор**ыш*** | **ты** ***крычыш*** |
| **ты** ***гоніш*** | **ты** *сп**іш*** | **ты** *дрыж**ыш*** | **ты** ***абветрыш*** |
| **ты** ***выходзіш*** | **ты** *віс**іш*** | **ты** *маўч**ыш*** | **ты** ***залежыш*** |
| *у 2-ой асобе множнага ліку* **(ВЫ)** | | | |
| ***-іце*** **(пасля мяккіх зычных)** | | ***-ыце*** **(пасля зацвярдзелых зычных)** | |
| **вы** ***стаіце*** | **вы** *гледз**іцé*** | **вы** *гавор**ыце*** | **вы** ***крычыце*** |
| **вы** ***гоніце*** | **вы** *сп**іцé*** | **вы** *дрыж**ыце*** | **вы** ***абветрыце*** |
| **вы** ***выхóдзіце*** | **вы** *віс**іцé*** | **вы** *маўч**ыце*** | **вы** ***залежыце*** |
| *у 1-ай асобе множнага ліку* **(МЫ)** | | | |
| ***-ім*** **(пасля мяккіх зычных)** | | ***-ым*** **(пасля зацвярдзелых зычных)** | |
| **мы** ***стаім*** | **мы** ***глядзім*** | **мы** ***гаворым*** | **мы** ***крычым*** |
| **мы** ***гонім*** | **мы** ***спім*** | **мы** ***дрыжым*** | **мы** ***абветрым*** |
| **мы** ***выхóдзім*** | **мы** ***вісім*** | **мы** ***маўчым*** | **мы** ***залежым*** |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ
ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# ПРАВАПІС НЕКАТОРЫХ СУФІКСАЎ ДЗЕЯСЛОВАЎ

| • *-ава- /-ява-* | • *-ва-* |
|---|---|
| *Калі ў форме 1-й асобы адзіночнага ліку дзеяслоў заканчваецца на:* | |
| *-ую (-юю)*:<br>*святк<u>ую</u> – святкаваць, святкаваў;*<br>*мал<u>юю</u> – маляваць, маляваў;* | *-ваю*:<br>*загад<u>ваю</u> – загадваць, загадваў;*<br>*расказ<u>ваю</u> – расказваць, расказваў;* |
| • *-іва- /-ыва-* | |
| **Пішацца пасля збегу зычных, апошнімі з якіх з'яўляюцца *л, н, р*:**<br>***падтры<u>мл</u>іваць, праве<u>тр</u>ываць*** | |
| ***Заўвагі!*** **1. Калі інфінітыў закончанага трывання на *-іць* мае папярэдні галосны, то ў незакончаным трыванні перад суфіксам *–ва-* замест *і* вымаўляецца і пішацца *й*: *супако<u>іць</u> – супакойваць.***<br>**2. Перад суфіксамі прошлага часу *-л-(-ў-)* захоўваюцца галосныя, якія ўжываюцца перад *-ць* у інфінітыве: *належаць – належаў, належала; дагледзець – дагледзеў, дагледзела*** | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ
ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# ПРАВАПІС НЕ (НЯ), НІ З ДЗЕЯСЛОВАМІ

| *Асобна* | *Разам* |
|---|---|
| • **большасць дзеясловаў:**<br>***не жыў,***<br>***не напісаў,***<br>***не зрабіў;***<br>• **ні ад дзеясловаў пішацца заўсёды асобна:**<br>***Куды ні глянеш, прыгажосць навокал.*** | • **з дзеясловамі, што не ўжываюцца без не-(ня)-:** ***ненавідзець, непакоіць;***<br>• **у дзеясловах і вытворных ад іх словах у складзе прыстаўкі** ***неда-*****, якая абазначае неадпаведнасць патрэбнай нормы:** ***недаглядзець, недаварыць.***<br>**Заўвага!**<br>**Трэба адрозніваць дзеясловы з прыстаўкай** ***да-*****, якая абазначае недаведзенае да канца дзеянне (разам з адмаўленнем не):** ***не дапісаць пісьмо, не даехаць дадому.*** |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ
ИМ.Ф.СКОРИНЫ